ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 355.082(470+571)(093.3)+821.161.1.09-94
https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-2-166-175

Паступіў у рэдакцыю 10.07.2018
Received 10.07.2018

**Д. Ч. Матвейчык**

*Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ДЫСКУСІЯ ВАКОЛ ВЫХАДУ МЕМУАРАЎ МІХАІЛА МУРАЎЁВА І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ПАЎСТАННЯ 1863–1864 гг.

**Аннотация.** Восстание 1863–1864 гг. является одной из наиболее дискуссионных тем в истории Беларуси периода вхождения в состав Российской империи. Подобная дискуссионность зародилась еще в XIX в., и одной из причин ее появления следует признать источниковедческий фактор. Одним из наиболее часто используемых источников о событиях 1863–1864 гг. являются мемуары виленского генерал-губернатора Михаила Муравьева, опубликованные в 1882–1883 гг. в журнале «Русская старина». Они сразу вызвали активную дискуссию среди историков и публицистов, предметом которой стали многочисленные случаи тенденциозной интерпретации М. Муравьевым исторических фактов, самопрославления и лжи. В ней участвовали такие деятели, как Михаил Семевский (издатель мемуаров), Николай Берг, Евгений Карнович, Пётр Валуев, Сергей Южаков, Александр Павлов, Иван Аксаков, Александр Мосолов и другие. В целом, дискутанты разделились на два лагеря – критиков и сторонников Муравьева. Первые стремились, на основании критики муравьевских постулатов, к вскрытию допущенных искажений и представлению более объективной картины происходившего, вторые всячески поддерживали и оправдывали все написанное. Дискуссия закрепила наличие в российской историографии полярных взглядов и оценок М. Муравьева как личности и как государственного деятеля на должности виленского генерал-губернатора, а также привлекла дополнительное внимание историков к проблематике восстания в целом.

**Ключевые слова:** историография, дискуссия, Михаил Муравьев, мемуары, рецензия, Беларусь, Литва, Российская империя, восстание 1863–1864 гг.

**Для цитирования:** Матвейчык, Д. Ч. Дыскусія вакол выхаду мемуараў Міхаіла Мураўёва і яе ўплыў на развіццё гістарыяграфіі паўстання 1863–1864 гг. // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2019. – Т. 64, № 2. – С. 166–175. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-2-166-175

**D. Ch. Matveichyk**

*National Historical Archives of Belarus, Minsk, Belarus*

# THE DEBATE ON THE PUBLISHING OF THE MEMOIRS OF MIKHAIL MURAVYOV AND ITS IMPACT ON THE DEVELOPMENT OF THE HISTORIOGRAPHY OF THE 1863–1864 UPRISING

**Abstract.** The Uprising of 1863–1864 is one of the most controversial issues in Belarusian history of the period when Belarus was a part of the Russian Empire. This issue started being controversial in the 19$^{th}$ century, one of the important reasons for discussions was the source study factor. One of the most commonly used sources on the events of 1863–1864 was the memoirs of the Vilna Governor-General Mikhail Muravyov, published in the Russian Antiquity (Russkaya Starina) magazine. They sparked heated debate among historians and publicists, the subject of the debate was numerous cases of biased interpretation of historical facts by M. Muravyov, self-glorification and lies. Such figures as Mikhail Semevsky (the publisher of the memoirs), Nikolai Berg, Yevgeniy Karnovich, Pyotr Valuev, Sergei Yuzhakov, Alexandr Pavlov, Ivan Aksakov, Alexandr Mosolov and others were the participants of the discussion. In general, the participants were divided into two groups – critics and supporters of Muravyev. The firsts sought, based on the critic of the Muravyov postulates, to reveal the distortions and to present more objective picture of what had been happening, the seconds supported and justified everything that had been written in every possible way. The discussion confirmed the presence in the Russian historiography of the polar views and assessments of M. Muravyov as a person and as a statesman in the position of the Governor-General of Vilna, as well as attracted additional attention of historians to the issue of the Uprising in general.

**Keywords:** historiography, discussion, Mikhail Muravyov, memories, review, Belarus, Lithuania, Russian Empire, Uprising of 1863–1864

**For citation:** Matveichyk D. Ch. The debate on the publishing of the memoirs of Mikhail Muravyov and its impact on the development of the historiography of the 1863–1864 Uprising. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2019, vol. 64, no. 2, pp. 166–175 (in Belarusian). https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-2-166-175

© Матвейчык Д. Ч., 2019

Паўстанне 1863–1864 гг. з'яўляецца лёсавызначальнай падзеяй для гісторыі Беларусі перыяду Расійскай імперыі. Праведзеныя пасля яго пераўтварэнні істотна паўплывалі на ўсе без выключэння сферы жыцця беларускага народа. Аднак супярэчлівасць самога паўстання, розныя адносіны да яго разнастайных сацыяльных груп, неадназначнасць вынікаў і шматлікія іншыя фактары з'яўляюцца падставай таго, што ацэнкі як яго ў цэлым, так і яго асобных бакоў і дзеячаў у прыватнасці даюцца рознымі даследчыкамі часам дыяметральна супрацьлеглыя. Падобная супярэчлівасць падыходаў да даследавання і ацэнак не з'яўляецца характэрнай рысай выключна цяперашняга часу. Яна з'явілася адразу пасля паўстання, калі гістарычныя і мемуарныя творы ствараліся прадстаўнікамі розных варагуючых бакоў: расійскага – непасрэдна ў імперыі, паўстанцкага – у эміграцыі.

Адной з самых супярэчлівых асоб у ацэнках падзей паўстання з'яўляецца віленскі генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў (на пасадзе з 1 мая 1863 г. па 17 красавіка 1865 г.). Яго ацэнкі ў польскай гістарыяграфіі, як у ранейшы, так і ў цяперашні час, з'яўляюцца негатыўнымі. Адзін з найбольш папулярных эпітэтаў у адносінах да яго – «Вешальнік», які перайшоў у беларускую гістарыяграфію, а таксама ўжываецца ў некаторых расійскіх працах. Аднак сярод расійскіх дарэвалюцыйных даследчыкаў і публіцыстаў яго вобраз быў неадназначным і залежаў нярэдка ад палітычнай кан'юнктуры ў пэўны перыяд. З аднаго боку, не выклікала пытанняў неабходнасць задушыць паўстанне, у тым ліку ў Беларусі і Літве, аднак, з другога – ужытыя для гэтага сродкі, праведзеныя мерапрыемствы і іх паспяховасць, адпаведнасць дзеянняў існуючаму заканадаўству, асабістыя якасці Мураўёва і іншыя моманты часам выклікалі гарачыя дыскусіі.

Прычын такой дыскусійнасці шмат, і адна з іх заключаецца ў крыніцазнаўчым аспекце. Справа ў тым, што адной з галоўных крыніц па гісторыі дзейнасці М. Мураўёва ў Вільні з'яўляюцца менавіта яго мемуары, а ў 1880–1890-я гг., калі мэтанакіраваная распрацоўка комплексаў архіўных дакументаў практычна не вялася, яны з'яўляліся хіба што асноўнай крыніцай. І менавіта на крытыцы ці падтрымцы мураўёўскіх пастулатаў гісторыкі і публіцысты часта будавалі свае тэкставыя канструкцыі і фарміравалі свае адносіны.

Найбольш ранняя дыскусія была выклікана ўласна публікацыяй саміх успамінаў. Яна ахапіла шырокія колы расійскіх інтэлектуалаў і ў значнай ступені паўплывала на далейшае фарміраванне палярных поглядаў на асобу Мураўёва ў расійскай гістарыяграфіі. Аднак да цяперашняга часу невядома ніводнай працы, дзе гэтая дыскусія выступала б у якасці прадмета даследавання і дзе была б раскрыта яе роля ў далейшых напрацоўках па гісторыі паўстання ў цэлым.

Згаданыя ўспаміны былі надрукаваны ў 1882–1883 гг. у часопісе «Руская даўніна» (рус. – «Русская старина») пад назвай «Нататкі пра кіраванне Паўночна-Заходнім краем і пра замірэнне ў ім бунту» [17]. Напісаныя, а больш дакладна – прадыктаваныя Аляксандру Масолаву яшчэ ў перыяд з 2 студзеня па 4 красавіка 1866 г., яны доўгі час захоўваліся ў нашчадкаў, хаця ў Санкт-Пецярбургу распаўсюджваліся некаторыя рукапісныя копіі. Друк быў зроблены на падставе арыгінала, які захоўваўся ў старэйшага ўнука М. Мураўёва. «Нататкі» з'яўляюцца супярэчлівым творам, бо былі створаны, як сведчыць іх змест, у перыяд псіхалагічнага крызісу аўтара. На той час М. Мураўёў, будучы практычна адхіленым ад удзелу ў дзяржаўным жыцці і маючы вялікія праблемы са здароўем, жыў у сваім маёнтку ў правінцыі і перажываў глыбокую крыўду на чыноўнікаў з бліжэйшага акружэння Аляксандра II. Паводле слоў рэдактара часопіса і выдаўца ўспамінаў Міхаіла Сямеўскага, твор напісаны ў стане *«хваравітага раздражнення»* [17, 1883 г., № 1, с. 149].

Рыторыка М. Мураўёва ў адносінах да некаторых вышэйшых чыноўнікаў з'яўляецца вельмі вострай, а інтэрпрэтацыя фактаў – тэндэнцыйнай. Напрыклад, сярод вышэйшых іерархаў дзяржавы ён вынаходзіць «польскую партыю» ў 1863–1866 гг., у склад якой уводзіць асоб, якія знаходзіліся ў бліжэйшым акружэнні імператара і актыўна імкнуліся задушыць паўстанне, – міністра ўнутраных спраў Пятра Валуева, начальніка III Аддзялення Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі і шэфа Корпуса жандараў Васілія Далгарукава, міністра замежных спраў Аляксандра Гарчакова і шматлікіх іншых. Усё гэта вымусіла М. Сямеўскага пры публікацыі ўставіць у шматлікіх месцах свае каментарыі, дзе ён выкрываў зробленыя памылкі альбо даваў зусім іншую інтэрпрэтацыю падзеям ці характарыстыкі згаданым асобам. Прычым рыторыка самога рэдактара ў адносінах да М. Мураўёва таксама дастаткова вострая. Напрыклад, адзначаецца, што

*«бесстароннасць у ацэнцы людзей, іх маральных якасцей і значэння іх грамадскай дзейнасці ніколі не была здабыткам розуму гр. М. М. Мураўёва»*, у яго водгуках пра некаторых сучаснікаў назіраецца *«рэзкасць і зласлівасць»* [17, 1882 г., № 11, с. 338], а пэўныя яго сцвярджэнні – не больш чым *«бязглуздыя меркаванні»* [17, 1883 г., № 1, с. 148]. Характарыстыкі, якія змешчаны ў каментарыях, сведчаць пра дастаткова крытычны погляд і на асобу былога віленскага генерал-губернатара, і на яго дзейнасць. У рыторыцы М. Сямеўскага маюцца, напрыклад, наступныя фразы: *«Мураўёўскі тэрор»*, *«лютасць»*, *«заўзятасць і віртуознасць у справе ганенняў»* [17, 1882 г., № 12, с. 638], *«суровы экс-дыктатар віленскі»* [17, 1883 г., № 1, с. 145] і інш. І ў цэлым, мемуары М. Мураўёва, паводле М. Сямеўскага, з'яўляюцца настолькі складаным і неадназначным творам, што да яго думак *«будучы гісторык літоўска-польскай смуты і барацьбы з ёй Расіі павінен аднесціся з вялікай асцярожнасцю»* [17, 1883 г., № 1, с. 149].

Больш таго, некаторыя пасажы ў «Нататках» не маглі быць выдадзены ў 1882–1883 гг. нават пры каментаванні рэдактара, а таму апушчаны пры публікацыі. Справа ў тым, што ў крытыцы сваіх палітычных праціўнікаў М. Мураўёў спыняецца літаральна ў адным кроку ад Аляксандра II. У некаторых сваіх фразах ён выстаўляе ў карыкатурным выглядзе нават вялікага князя Канстанціна Мікалаевіча – брата Аляксандра II і дзядзьку Аляксандра III, напрыклад, ставіць яго на чале «польскай партыі» ў Санкт-Пецярбургу альбо апісвае яго злосць падчас праезду праз Вільню. Такія радкі кідаюць цень як на апошняга, які знаходзіўся на троне на момант выдання «Нататак», так і ў цэлым на імператарскую фамілію[1].

Аднак нават пасля ўсіх каментарыяў і купюр М. Сямеўскі апасаўся, што з-за рэзкасці М. Мураўёва ў выказваннях цэнзура не прапусціць «Нататкі» і *«накладзе сваю жалезную лапу»* на іх. Тым не менш, падрыхтоўка і выхад прайшлі *«без сучка і задзірынкі»*. У сваіх аўтабіяграфічных нататках ён гэта звязваў са спагадлівым стаўленнем міністра ўнутраных спраў графа Дзмітрыя Талстога, якому прыпісваў яго *«абарону»* (цыт. паводле: [22, с. 126]).

Яшчэ адна характэрная рыса «Нататак» – адносна невялікая колькасць дат і ў цэлым фактаграфічных звестак, што характэрна для публіцыстычных твораў. М. Мураўёў спыняецца на падрабязнасцях пераважна толькі ў пачатковай частцы, а большая палова яго тэксту з'яўляецца выкладаннем уражанняў пра разнастайныя падзеі і ўласных разважанняў, а таксама падачай характарыстык яго сучаснікаў.

Тым не менш, «Нататкі» з'яўляюцца каштоўнай гістарычнай крыніцай адразу ў некалькіх кірунках. Па-першае, у іх апісаны асноўныя, на думку самога М. Мураўёва, захады па задушэнні паўстання ў Беларусі і Літве, а таксама пададзена матывацыя, якая выклікала іх увядзенне. Па-другое, яны выразна паказваюць бачанне самім Мураўёвым сваёй ролі ва ўсіх падзеях яго ўласнымі вачыма. Па-трэцяе, тая фактаграфія, што маецца ў мемуарах, дазваляе ўдакладніць у шматлікіх выпадках храналогію тых ці іншых падзей і іх удзельнікаў, а таксама пазіцыю іншых асоб і іх адносіны да розных бакоў паўстання.

Публікацыя «Нататак» адыграла важную ролю ў далейшым развіцці гістарыяграфіі паўстання ў Расійскай імперыі, стаўшы своеасаблівым старт-сігналам для вялікай колькасці мемуарыстаў, даследчыкаў, рэдактараў і выдаўцоў. У палітычным плане выхад мемуараў сведчыў пра дазволенасць падобнай тэматыкі на старонках перыядычнага друку і ў выглядзе асобных кніг і брашур. Цэнзурная ж апрацоўка не толькі вызначыла межы недазволенага пры напісанні адпаведных тэкстаў, але і акрэсліла прастору дапушчальнага.

Для паўнаты карціны варта адзначыць, што не толькі «Нататкі» ўплывалі ў гэты перыяд на развіццё расійскай гістарыяграфіі паўстання ў Беларусі. Для павелічэння ў першай палове 1880-х гг. колькасці адпаведных публікацый меліся і іншыя перадумовы. Усё большая часавая аддаленасць ад падзеі спрыяла паступоваму зніжэнню напружанасці ў яе ўспрыманні сучаснікамі. «Польскае пытанне» значна радзей згадвалася на старонках расійскай перыядычнай прэсы ў якасці надзённай праблемы. Вастрыня і эмацыянальнасць рыторыкі істотна зніжаліся ў параўнанні

[1]Выразаныя цэнзурай часткі мемуараў былі адноўлены на падставе рукапісных матэрыялаў фонду «Рускай даўніны» і ўпершыню выдадзены на польскай мове ў 1906 г. Валерыем Пшыбароўскім у аўстра-венгерскім Львове [24]. На рускай мове яны апублікаваны Канстанцінам Пятровым у 2008 г. у Маскве [16]. У Беларусі перавыдадзены Аляксандрам Фядутам у 2016 г. у Мінску [18].

з публікацыямі 1860-х гг. Грамадская ўвага ў Расійскай імперыі на працягу другой паловы 1860 – пачатку 1880-х гг. паступова пераключалася на іншыя «гучныя» праблемы і падзеі ўнутранай і знешняй палітыкі – правядзенне «вялікіх рэформ», руска-турэцкая вайна 1877–1878 гг. і яе водгукі ў Еўропе, дзейнасць расійскіх рэвалюцыянераў, забойства Аляксандра II і інш. Прыкладам можа паслужыць палемічны артыкул 1881 г. Аляксея Уладзімірава – публіцыста і педагога, які ў 1860–1880-я гг. выкладаў у навучальных установах Вільні, – прысвечаны праекту ўвядзення рускай мовы ў богаслужэнні ў каталіцкіх і пратэстанцкіх храмах Беларусі і Літвы [5]. Вобраз каталіка, у тым ліку ксяндза і памешчыка, у ім пазбаўлены тых негатыўных штампаў, якія масава прысутнічалі ў перыяд знаходжання на пасадзе віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва, Канстанціна фон Каўфмана і Эдуарда Баранава. А. Уладзіміраў не патрабуе барацьбы з рымска-каталіцкім касцёлам і крытыкуе ўсіх рускіх чыноўнікаў, якія ў 1860-я гг. займаліся прымусовым пераводам беларусаў-каталікоў у праваслаўе, за няздольнасць, некампетэнтнасць і ўжыванне *«сродкаў, не адпавядаючых ні мэце, ні духу часу»* [5].

Зніжэнню напружанасці ў грамадстве спрыяла таксама адмена найбольш адыёзных мерапрыемстваў М. Мураўёва і яго наступнікаў у Беларусі і Літве (прымусовы перавод сялян з каталіцтва ў праваслаўе, закрыццё касцёлаў, абмежаванні па службе каталікоў і г. д.), а таксама выданне некалькіх амністый (1866, 1867, 1868, 1871, 1873, 1874, 1883 гг. і інш.), у выніку якіх шматлікія катэгорыі паўстанцаў альбо «палітычна нядобранадзейных» асоб атрымалі палёгкі пакарання, а некаторыя змаглі вярнуцца на радзіму.

Вынікі падобнага збегу шматлікіх акалічнасцей з’явіліся хутка. Ужо ў 1883 г. выйшаў у свет адразу шэраг публікацый, якія так ці інакш закраналі паўстанне ў Беларусі і Літве. Нават самі «Нататкі» М. Мураўёва публікаваліся з некаторымі дадаткамі. Некаторыя з іх, як, напрыклад, кароткае апавяданне яго брата Андрэя пра абставіны прызначэння на пасаду віленскага генерал-губернатара, публікаваліся непасрэдна пасля тэкстаў асобных частак успамінаў [15] (праз 2 гады перавыдадзены асобна ў часопісе «Рускі архіў» [14]). Апошняя частка публікацыі з’яўлялася непасрэдным тэматычным працягам мемуараў і мела назву «Дадаткі». У ёй былі змешчаны тэксты некаторых дакументаў, падабраных самім М. Мураўёвым, а таксама ўрыўкі з яго карэспандэнцыі з П. Валуевым, некаторыя прысвечаныя яму вершы, водгукі пра яго некаторых сучаснікаў (напісаны Анатолем Ягоравым [7]) і некалькі іншых дакументаў [17, 1883 г., № 4, с. 193–230; 1884 г., № 6, с. 572–584]. У некаторых нумарах часопіса, дзе выходзілі часткі «Нататак», пачалі друкавацца творы іншых мемуарыстаў пра паўстанне альбо пра некаторых звязаных з ім дзеячаў. Напрыклад, два свае мемуарныя творы (пра стан у Варшаве ў 1860–1861 гг. і пра намесніка ў Царстве Польскім Фёдара Бэрга) апублікаваў генерал і ваенны пісьменнік Павел Карцаў [10; 11]. Да першага з іх была дададзена перапіска намесніка ў Царстве Польскім князя Міхаіла Гарчакова і Аляксандра II, другі выклікае цікавасць апісанай сцэнай сустрэчы двух дзеячаў – Ф. Бэрга і М. Мураўёва – у Вільні ў 1864 г. Пры гэтым сімпатыі самога П. Карцава – выразна на баку другога з іх [3, с. 318–321].

Аднак найбольшы грамадскі рэзананс выклікала дыскусія, прадметам якой сталі «Нататкі» М. Мураўёва і якая распачалася яшчэ падчас іх публікацыі. М. Сямеўскі назваў гэта *«вельмі ажыўленая палеміка ў нашых газетах»* [22, с. 126]. У самой прадмове пісалася, што часопіс *«з найвялікшай гатоўнасцю, як і заўжды, адкрывае свае старонкі ўсім на іх пярэчанням, тлумачэнням і абвяржэнням»* [17, 1882 г., № 11, с. 389]. Вынікі не прымусілі чакаць сябе. Ужо ў «Дадатках» выкладчык Варшаўскага ўніверсітэта гісторык Мікалай Бэрг у 1883 г. выступіў з двума палемічнымі артыкуламі, дзе падаў некаторыя абвяржэнні. У першым з іх, будучы даследчыкам паўстання ў Царстве Польскім і добра знаёмым з дзейнасцю на пасадзе намесніка ў ім Ф. Бэрга, ён рэзка негатыўна выказаўся і пра апісанне П. Карцавым Ф. Бэрга (*«выяўлены нейкім нясмелым школьнікам»*), і пра М. Мураўёва. Дадзеная М. Бэргам характарыстыка апошняму – *«Віленскі сатрап»* [2, с. 214], якому прыпісваецца, сярод іншага, *«дзікая пагроза» «спаліць кляштар, а смецце зраўнаваць з зямлёй»* [2, с. 216].

Другі артыкул прысвечаны ўласна асобе М. Мураўёва і з’ўляецца спробай падаць іншы яго вобраз – адрозны ад таго, што пачынаў фарміравацца ў расійскай публіцыстыцы. Менавіта на гэты намер М. Бэрг прама ўказваў у сваім артыкуле: *«З часу з’яўлення ў “Рускай Даўніне”*

*“Нататак” графа М. М. Мураўёва з’явілася некалькі артыкулаў і заметак у нашых перыядычных выданнях пра гэты важны факт. Большая частка выстаўляла Мураўёва амаль не геніяльным адміністратарам <...> Іншыя ж (такіх было вельмі няшмат) знаходзілі, што Мураўёў нічога асабліва не зрабіў, што ён толькі скончыў пачатае У. І. Назімавым*[1]*. Ні тая, ні другая думка несправядлівая»* [2, с. 216]. Лейтматывам артыкула М. Бэрга з’яўляецца наступны абзац – *«У М. М. Мураўёве не было і ценю геніяльнага адміністратара. Але, тым не менш, ён супакоіў край, прыведзены яго намеснікам у нечуваны непарадак; але супакоіў яго захадамі, якія ў Еўропе лічацца варварствам, брутальным азіяцкім тэрорам»* [3, с. 217]. Асабістая пазіцыя М. Бэрга – *«Не, рускім трэба асабліва ўстрымлівацца ад усялякіх усхваленняў спадароў Мураўёвых»* [3, с. 217]. Тут жа ён паўтарае свой ранейшы эпітэт у адносінах да яго – *«бульдог»* [3, с. 220]. Артыкул з’яўляецца адной з першых спроб падаць гістарычны вобраз асобы М. Мураўёва падчас дзейнасці на пасадзе віленскага генерал-губернатара. Ён складзены на падставе *«асабістага вывучэння»* перыяду, а таксама *«на апавяданнях і друкаваных сведчаннях кампетэнтных асоб»* [3, с. 218]. У цэлым твор М. Бэрга накіраваны супраць аднабаковага ўспрымання М. Мураўёва яго палітычнымі праціўнікамі ці прыхільнікамі і на раскрыццё яго больш рэалістычнага (на думку аўтара) і супярэчлівага вобраза.

Сярод першых да дыскусіі далучыўся адзін з герояў «Нататак» – былы міністр унутраных спраў Пётр Валуеў, якога М. Мураўёў шматразова выстаўляў у самым негатыўным святле. Яго заўвагі былі зроблены паводле просьбы М. Сямеўскага адразу пасля іх выхаду – у маі 1883 г., хаця апублікаваны толькі ў 1890 г. [4]. П. Валуеў сцвярджаў, што *«аднабокасць погляду графа Мураўёва, неразборлівасць нараканняў і адсутнасць аб’ектыўнасці пры ацэнцы асоб і доказаў, пры ацэнцы альбо выкладанні фактаў так відавочныя, што распаўсюджвацца пра іх няма неабходнасці»* [4, с. 858], а таму спыняецца толькі на некаторых прыкладах. Для абвяржэння ўзведзеных абвінавачванняў на сябе і сваіх калег-міністраў П. Валуеў карыстаўся шматлікімі крыніцамі, у тым ліку сваім уласным дзённікам, які ён вёў на працягу шматлікіх гадоў. Запісы з яго ён шматразова цытуе, каб паказаць усю неадпаведнасць «Нататак» рэчаіснасці, напрыклад, у гісторыі прызначэння на пасаду віленскага генерал-губернатара. П. Валуеў ацэньвае М. Мураўёва як глыбока супярэчлівую асобу: *«Граф Мураўёў быў добрым у душы, мог быць мяккім, ветлівым, нават ласкавым, – і мог быць жорсткім, несправядлівым і зласліва помслівым. Ён быў надзвычай разумны, знаходлівы, распарадчы, але станавіўся непаслядоўным і нават неразважлівым, калі абставіны давалі поўную прастору яго зменлівай волі. Да выдатных рыс яго характару належалі se faire valais*[2]*, пры ўсялякім зручным выпадку, і бязмерная фанабэрыстасць, калі, як гаворыцца, яму шанцавала»* [4, с. 861]. Вартасць «Нататак», паводле П. Валуева, дастаткова невысокая – *«яны ўвогуле могуць мець гістарычную каштоўнасць толькі пры двайной умове значных скідак у адным кірунку і прыкідак у другім»* [4, с. 863]. Іх характарыстыка ў Валуева – *«аднабаковыя аповеды»* [4, с. 861].

На выхад «Нататак» адрэагавалі шматлікія часопісы ў Расіі. Ужо пасля публікацыі першых раздзелаў, у першым нумары за 1883 г. «Веснік Еўропы» адказаў асобным артыкулам, аўтар якога (падпісаны крыптанімам «Е. Л.» віленскі чыноўнік «назімаўскага» і «мураўёўскага» перыядаў) абрынуўся з гнеўнай крытыкай на М. Мураўёва і ўсю яго сістэму кіравання ў Беларусі і Літве з мэтай садзейнічаць вызначэнню *«сапраўднага тагачаснага стану спраў у Паўночна-Заходнім краі»* [6, с. 388]. Агульная ацэнка дзеянняў М. Мураўёва – *«унёс нечуваны тэрор у нешчаслівы край»* [6, с. 388]. Аўтар артыкула робіць упор на хлуслівай інтэрпрэтацыі ў «Нататках» фактаў, напрыклад, становішча «Паўночна-Заходняга краю» падчас свайго прыбыцця ў Вільню як усеагульна ахопленага паўстаннем. Паводле Е. Л., *«“узброенае” паўстанне было тады ўжо амаль задушана. Нікчэмныя рэшткі разбітых паўстанцкіх банд хаваліся яшчэ па лясах, ратуючыся ад праследаванняў і злучаючыся часам у больш значныя шайкі для ўласнай абароны, але не для нападу»* [6, с. 389]. У цэлым, намаляваная Е. Л. карціна кіравання М. Мураўёвым мае выключна цёмныя адценні. Напрыклад, тэрмін «тэрор» сустракаецца ў невялікім аўтарскім апавяданні восем

[1] Уладзімір Іванавіч Назімаў – віленскі генерал-губернатар у 1855–1863 гг.

[2] У перакладзе з французскай мовы – «выстаўляць сябе каштоўным».

разоў; іншыя характарыстыкі мураўёўскай палітыкі – *«самавольства і беззаконне»*, *«разгром»*, *«граза і няшчасці»*, *«праследаванне за веру і паходжанне»*, *«павальнае выгнанне каталікоў»*, *«сістэма шпіёнства і даносаў»* і да т. п. У якасці аднаго з доказаў сваіх слоў Е. Л. апублікаваў цыркуляр К. фон Каўфмана, складзены на падставе рапарта Часовага палявога аўдытарыята ад 5 кастрычніка 1865 г. аб шматлікіх злоўжываннях у дзейнасці самога аўдытарыята, а таксама следчых і судовых камісій, якія дзейнічалі ў Беларусі і Літве ў 1863–1865 гг., што мела сваім вынікам тысячы невінаватых ахвяр.

Напрыканцы 1883 г. з аб'ёмнай рэцэнзіяй на «Нататкі» выступіў былы правіцель спраў канцылярыі папячыцеля (1850(1851?)–1859 гг.) і былы сябра кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі Яўгеній Карновіч. У двух нумарах часопіса «Назіральнік» (а затым асобным адбіткам) ён апублікаваў падрабязны аналіз мемуараў Мураўёва на прадмет адпаведнасці рэчаіснасці пад назвай «Роздум над "Нататкамі" графа М. М. Мураўёва» [8; 9]. Імкненне да напісання рэцэнзіі Я. Карновіч тлумачыць наступным чынам: *«Канешне, не толькі можна, але нават і цалкам натуральна дапускаць у сваіх "Нататках", альбо ўспамінах, пэўную долю ўсхвалення сваёй уласнай асобы, але наўрад ці дазваляецца выстаўляць сябе адзіным багатыром, нейкім палітычным Іллёй Мурамцам нашых дзён, і з гэтай мэтай скажаць у вядомым, спрыяльным для сябе кірунку нават агульны ход падзей, фарбуючы іх не ў той колер, у якім яны паўставалі тады і паўстаюць цяпер <...>»* [8, № 11, с. 154]. У сваіх высновах Я. Карновіч быў у цэлым салідарны з М. Сямеўскім, М. Бэргам і Е. Л., аднак яго развažанні і прыклады маюць значна больш шырокі маштаб. Напрыклад, каб паказаць хлуслівасць пазіцыі М. Мураўёва пра тое, што гэта менавіта ён аднавіў *«годнасць рускага ўрада не толькі ў заходнім краі, але і ў Еўропе»*, Я. Карновіч паказвае шырокую карціну знешнепалітычнага становішча Расійскай імперыі напярэдадні і падчас паўстання, на якое віленскі генерал-губернатар не меў і нават не мог мець істотнага ўплыву [8, № 11, с. 154–159]. Аналагічным чынам ацэньваюцца заявы М. Мураўёва пра нібыта неспрыяльнае для яго становішча ў Беларусі і Літве. У якасці контраргументаў Я. Карновіч паказвае, што ў «Нататках» замоўчваюцца *«надзвычай спрыяльныя акалічнасці»*, якія меліся ў распараджэнні М. Мураўёва і адсутнічалі ў яго папярэднікаў, у тым ліку і ў У. Назімава, і падрабязна спыняецца на іх аналізе [8, № 11, с. 165–170]. Таксама разбіваецца асноўны тэзіс М. Мураўёва аб мэтазгоднасці яго дзейнасці па русіфікацыі – нібыта большае апалячанне «Паўночна-Заходняга краю» ў 1863 г. у параўнанні з 1830–1833 гг., калі ён знаходзіўся на пасадах губернатара ў Магілёве і Гродне [8, № 11, с. 170–174], а таксама шматлікія іншыя сцвярджэнні, змешчаныя ў «Нататках». Характарызуючы ў цэлым дзейнасць былога генерал-губернатара, Я. Карновіч сцвярджае, што *«ўрадавая сістэма Мураўёва, заснаваная на нейкіх "узвялічваннях, пранікненнях, увядзеннях, укараненнях пачаткаў, элементаў і духу", з узнаўленнем усяго гэтага страхам і ўвогуле самымі крутымі карнымі і паліцэйскімі захадамі, з'яўляецца нейкай блытанінай і бязглуздзіцай»* [8, № 12, с. 37].

У самым канцы 1883 г. сваю рэпліку ў дыскусіі агучыў сацыёлаг і публіцыст Сяргей Южакоў [23]. Ён выступіў з крытыкай пазіцыі аб прызнанні за М. Мураўёвым рэпутацыі *«галоўнага рухавіка сялянскай справы»* ў Беларусі і Літве. На яго думку, сялянская рэформа рэалізоўвалася без уплыву М. Мураўёва, і не ён быў галоўным ініцыятарам шматлікіх мерапрыемстваў па прыняцці палёгкаў сялянам. Параўнаўшы павелічэнні сялянскіх надзелаў на іншых ахопленых паўстаннем тэрыторыях (у Польшчы і Украіне), ён прыйшоў да высновы, што беларускія і літоўскія сяляне атрымалі менш у параўнанні з польскімі і ўкраінскімі. У цэлым, паводле яго, *«Сялянская рэформа ў Расіі здзяйснялася насуперак Мураўёву; не яму ж абавязана заходняя Расія больш поўным развіццём прынцыпаў гэтай рэформы»* [23, с. 378].

У 1885 г. да дыскусіі далучыўся палкоўнік Аляксандр Паўлаў – былы ад'ютант У. Назімава і старшыня Віленскай следчай па палітычных справах камісіі. Яго твор з'яўляецца нарысам дзейнасці У. Назімава на пасадзе віленскага генерал-губернатара, напісаным у снежні 1884 г. і апублікаваным спачатку ў трох нумарах часопіса «Руская даўніна» за першую палову 1885 г. [20], а затым асобнай брашурай [21]. Пабудкай для напісання свайго нарыса А. Паўлаў проста называе выданне «Нататак» М. Мураўёва, у якіх змешчана вострая крытыка як асобных мерапрыемстваў,

так і ўсёй дзейнасці У. Назімава на згаданай пасадзе. А. Паўлаў уступае ў палеміку з М. Мураўёвым на прадмет ролі асоб, якія займалі да яго пасаду генерал-губернатара, у першую чаргу У. Назімава, у высняванні абставін, якія паспрыялі ў далейшым развіццю паўстання, а таксама ў яго задушэнні ў пачатковы перыяд. Мэта палемікі – *«апраўдаць»* як самога У. Назімава, так і ўсіх яго папярэднікаў ад выстаўленых ім абвінавачванняў. Пры гэтым А. Паўлаў не адмаўляе вялікіх заслуг М. Мураўёва ў задушэнні паўстання і стварэнні палітыкі па русіфікацыі Беларусі і Літвы. Ён канцэнтруе сваю ўвагу менавіта на тых фактах, *«якія Мураўёў выяўляе ў скажоным выглядзе»* [20, № 2, с. 402]. Асноўны сродак, якім карыстаецца А. Паўлаў, гэта – выяўленне супярэчнасцей у «Нататках». Іх пошук адбываецца двума шляхамі: 1) супастаўленне паміж сабой супярэчлівых частак тэксту М. Мураўёва; 2) параўнанне з фактамі, замоўчанымі М. Мураўёвым. Апрача гэтага, А. Паўлаў малюе шырокую карціну дзейнасці У. Назімава на пасадзе і яго ролю ў галоўных падзеях таго часу – правядзенні «вялікіх рэформ» у Расійскай імперыі і, у прыватнасці, вызваленні сялянства ад прыгнёту. Неправядзенне У. Назімавым тых мерапрыемстваў, якія праводзіліся пазней М. Мураўёвым, тлумачылася адсутнасцю паўнамоцтваў і грашовых сродкаў, дадзеных апошняму імператарам пры прызначэнні на пасаду. Увогуле, асоба У. Назімава і яго дзейнасць ацэньваецца станоўча, а няўдачы адносяцца на карысць інтрыг вакол яго альбо адсутнасці магчымасцей для дзеянняў. Пазіцыя ж яго крытыкаў характарызуецца наступным чынам: *«не пацырымоніліся сарваць лепшую кветку з помніка працоўнага жыцця Уладзіміра Іванавіча Назімава і ўпрыгожыць ёю альбом, які падносіцца пераемніку яго ўлады з адзінай мэтай – выклікаць да сябе прыхільнасць уплывовага вяльможы і такім спосабам умацаваць сваю службовую кар'еру»* [20, № 5, с. 336–337].

Нягледзячы на вышэйзгаданую спецыфіку ў падачы матэрыялу, «Нататкі» выклікалі таксама станоўчыя водгукі. У сакавіку 1883 г. у часопісе «Гістарычны веснік» з невялікай нататкай выступіў былы чыноўнік Нікалаеў[1]. Ён раскрытыкаваў у першую чаргу М. Сямеўскага як выдаўца і рэдактара «Рускай даўніны» ў цэлым і «Нататак» у прыватнасці. На яго думку, публікацыя мемуараў была *«заўчаснай»*, бо *«яшчэ жывыя многія асобы, якія былі вельмі нядаўна моцнымі і ўплывовымі, самалюбства якіх непазбежна закранаецца і абражаецца»* [19, с. 724]. Найбольшую крытыку ў Нікалаева выклікала рэдактарская апрацоўка «Нататак» – каментарыі і заўвагі М. Сямеўскага, якія, на яго думку, *«усяго меней адпавядаюць "гістарычнаму выданню"»* [19, с. 724] і дыскрэдытуюць увесь твор, у тым ліку праз *«вельмі недакладнае апісанне графа М. Мураўёва»* і *«дзіўныя тлумачэнні»* [19, с. 725, 726]. У сваіх палітычных схільнасцях Нікалаеў становіцца выразна на бок былога віленскага генерал-губернатара, характарыстыка якога – *«біўся за рускую справу, як адзінокі ваяр у полі»* [19, с. 724]. Усе характарыстыкі, дадзеныя М. Мураўёвым іншым саноўнікам, і яго бачанне сітуацыі ў «Паўночна-Заходнім краі» ці ў Санкт-Пецярбургу прымаюцца як найбольш слушныя. Пры гэтым спробы аналізу ўласна «Нататак» Нікалаеў не робіць, прыводзячы толькі асобныя фактаграфічныя альбо статыстычныя звесткі ў якасці контраргументаў М. Сямеўскаму.

Аналагічную танальнасць мае артыкул аднаго з найбольш вядомых у той час у імперыі славянафілаў Івана Аксакава, які выйшаў у газеце «Русь» 13 лістапада 1882 г. і пачынаецца са слоў *«Даўно ўжо не з'яўлялася ў друку такой павучальнай чытаніны»* [1]. У ім значна больш аб'ёмна разгорнута праслаўленне М. Мураўёва. І. Аксакаў нават не спыняецца перад тым, каб менавіта яму прыпісаць галоўную заслугу ў вызваленні беларускіх сялян з-пад прыгоннага права, а Аляксандру ІІ – *«антынацыянальны кірунак "ліберальнай" палітыкі»* [1, с. 1]. Пытанне пра неабходнасць верыфікацыі звестак з успамінаў нават не ставіцца. І. Аксакаў проста сцвярджае: *«Сумненняў у праўдзе Мураўёўскага апавядання для нас, сучаснікаў той эпохі, не можа быць ніякіх»* [1, с. 1]. Усе характарыстыкі, якія даюцца ў «Нататках», прызнаюцца цалкам справядлівымі і адпаведнымі рэчаіснасці. Аднак асноўную ўвагу І. Аксакаў канцэнтруе не на ўспамінах М. Мураўёва, а на крытыцы сваіх палітычных апанентаў (*«рускія неданоскі лібералізму»*, *«наш фальшывы, пустапарожні, гнілы лібералізм»*), верагодна, выказваючы такім спосабам сваё негатыўнае стаўленне да каментарыяў М. Сямеўскага (хаця яго імя ў артыкуле не ўказваецца). Прычым

[1] Яго подпіс зроблены ў форме «Г. И. Николаев»; больш дакладна ідэнтыфікаваць асобу не ўдалося.

у сваіх разважаннях ён часта адыходзіць далёка ад прадмета, які даў нагоду для публікацыі, часам нават пераходзіць на паралелі з руска-турэцкай вайной 1877–1878 гг.

На баку М. Мураўёва знаходзіўся таксама Аляксандр Масолаў – яго былы асабісты сакратар у 1863–1866 гг., успаміны якога пад назвай «Віленскія нарысы» выйшлі напрыканцы таго ж 1883 г. у «Рускай даўніне» [12]. Як пісаў за 15 гадоў да выдання твора сам А. Масолаў, штуршком да складання стала смерць іх галоўнага героя. Час напісання таксама вядомы – апошняя трэць 1866 – вясна 1867 г. Свой твор А. Масолаў бачыў прамым дадаткам да «Нататак» М. Мураўёва. Ён пісаў: *«Падчас іх апрацоўкі я меў на мэце дапоўніць гэтыя нататкі апісаннем таго, што адбывалася ў непасрэднай блізкасці да М. М. Мураўёва, тых пачуццяў і думак, якімі было прасякнута створанае ім асяроддзе, якое яго акружала, і ўвогуле даць цэльнае ўяўленне пра гэтую паваротную эпоху рускай гісторыі»* [13, с. IV–V]. На тое, што прычынай выдання «Віленскіх нарысаў» стала менавіта публікацыя «Нататак» М. Мураўёва, указваюць некалькі рэдактарскіх спасылак, зробленых непасрэдна ў тэксце[1]. У сваёй прадмове ў студзені 1867 г. А. Масолаў прапануе свой твор як *«матэрыял для гісторыка»* [12, 1883 г., № 10, с. 182].

А. Масолавым яго былы начальнік ацэньваецца станоўча амаль ва ўсіх выпадках. Яго характарыстыкі – *«галоўны дзеяч таго часу»*, надзелены *«чароўнымі дараваннямі, дзяржаўным розумам»*, *«цудоўная асоба»* [12, 1883 г., № 10, с. 182] і да т. п. Аднак твор А. Масолава не з’яўляецца хвалебным панегірыкам. Асноўная яго ўвага накіравана не на галаслоўнае праслаўленне М. Мураўёва, а на падзеі, сведкам якіх з’яўляўся аўтар і праз удзел М. Мураўёва ў якіх выводзіцца яго станоўчы вобраз. У мемуарах змешчаны ў асноўным шматлікія фактаграфічныя звесткі пра дзейнасць як М. Мураўёва, так і іншых асоб віленскай цывільнай і ваеннай адміністрацыі падчас і пасля паўстання. Прадстаўлены ў мемуарах храналагічны прамежак дастаткова вялікі і ахоплівае ўвесь перыяд знаходжання М. Мураўёва на пасадзе віленскага генерал-губернатара – ад прызначэння 1 мая 1863 г. да звальнення 17 красавіка 1865 г. Адпаведна, колькасць канкрэтнага гістарычнага матэрыялу з’яўляецца значнай. Напрыклад, тут змешчаны апісанні смяротных пакаранняў паўстанцаў, у тым ліку Зыгмунта Серакоўскага, сустрэч са шматлікімі дзеячамі, замаху на віленскага губернскага маршалка Аляксандра Дамейку і г. д. Існуе таксама вялікая колькасць характарыстык шматлікіх чыноўнікаў, аднак у большасці зробленых павярхоўна і без асаблівай глыбіні.

У некаторых абзацах А. Масолаў, які быў знаёмы з «Нататкамі» М. Мураўёва яшчэ ў час іх напісання ў 1866 г., бо менавіта ён запісваў іх пад дыктоўку, дазваляе сабе абвяргаць словы былога начальніка. Напрыклад, М. Мураўёў піша, што менавіта паводле яго прапановы і пратэкцыі наступнікам на пасадзе быў прызначаны К. фон Каўфман [17, 1883 г., № 1, с. 154–155]. А. Масолаў жа сцвярджае, што гэта – хлусня *«з мэтай паказаць свой уплыў на Гасудара»*, а сам Мураўёў *«ніяк не чакаў гэтага прызначэння, якое ў першы час яму было непрыемнае»* [12, 1883 г., № 12, с. 44].

На працягу 1883–1885 гг. згаданая вышэй дыскусія вакол М. Мураўёва і яго ролі ў задушэнні паўстання і кіраванні беларуска-літоўскімі землямі паступова заціхала. Яе ўдзельнікі, мяркуючы паводле невядомасці іх далейшых публікацый на тэму, засталіся на сваіх пазіцыях. Аднак яна мела пэўныя вынікі доўгачасовага характару. Па-першае, менавіта з таго часу ў рускай гістарыяграфіі замацаваліся палярныя ацэнкі асобы М. Мураўёва і ўсёй уведзенай ім сістэмы кіравання беларуска-літоўскімі землямі, што назіраецца да цяперашняга часу. Па-другое, дыскусія паспрыяла павелічэнню цікавасці ў расійскім грамадстве да тэматыкі паўстання, што ў сваю чаргу выклікала наступныя публікацыі, ужо не звязаныя непасрэдна з М. Мураўёвым. Да канца Расійскай імперыі ў 1917 г. у расійскім друку выйшла некалькі дзясяткаў толькі мемуарных твораў, прысвечаных паўстанню ў Беларусі і Літве («Паўночна-Заходнім краі»), вялікая колькасць артыкулаў, некалькі манаграфій і зборнікаў дакументаў. У цэлым, пачынаючы менавіта з 1880-х гг. тэматыка паўстання трывала замацавалася ў расійскай гістарыяграфіі.

[1] У 1898 г. А. Масолаў пісаў, што публікацыя «Нарысаў» у 1883 г. з’явілася *«дзякуючы настойлівасці нябожчыка М. І. Сямеўскага, які надрукаваў іх без майго дазволу пасля з’яўлення ў друку нататак графа М. М. Мураўёва»* [13, с. V]. Аднак на працягу 15 гадоў паміж першай публікацыяй у 1883 г. і перадрукам у 1898 г. ён публічна не выступіў з пратэстам і не выказаў незадавальненне самім фактам публікацыі альбо якасцю яе падрыхтоўкі.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. [Аксаков, И.] Москва, 13 ноября [По поводу «Записок М. Н. Муравьева о мятеже в Северо-Западном крае в 1863–1864 годах»] / [И. Аксаков] // Русь. – 1882. – 13 нояб. (№ 46). – С. 1–5.

2. Берг, Н. В. Гр. Ф. Ф. Берг и М. Н. Муравьев / Н. В. Берг // Рус. старина. – 1883. – № 4. – С. 214–216.

3. Берг, Н. В. Граф Михаил Николаевич Муравьев: К его «Запискам», напечатанным в «Русской Старине» изд. 1882–1883 гг. / Н. В. Берг // Рус. старина. – 1883. – № 4. – С. 216–229.

4. Валуев, П. А. Заметки на «Записки графа М. Н. Муравьева» / П. А. Валуев // Рус. старина. – Год 21. – 1890. – Т. 65, № 12. – С. 857–863.

5. Владимиров, А. П. О введении русского языка в богослужении католической и протестантской церкви в Северо-Западном крае / А. П. Владимиров // Вестн. Европы. – 1881. – № 2. – С. 366–375.

6. Е. Л. Следствие и суд над польскими повстанцами в Северо-Западном крае в 1863–1864 годах (по официальным документам) / Е. Л. // Вестн. Европы. – 1883. – № 1. – С. 388–399.

7. Егоров, А. Е. [Воспоминания] / А. Е. Егоров // Рус. старина. – 1883. – Т. 38, № 4. – С. 210–214.

8. Карнович, Е. П. Раздумье над «Записками» М. Н. Муравьева / Е. П. Карнович // Наблюдатель. – 1883. – № 11. – С. 153–178 ; № 12. – С. 21–39.

9. Карнович, Е. П. Раздумье над «Записками» М. Н. Муравьева / Е. П. Карнович. – [Б. м. : б. и., 1883]. – С. 153–178, 21–39.

10. Карцов, П. П. Варшава в 1860–1861 гг. Из воспоминаний генерал-лейтенанта / П. П. Карцов // Рус. старина. – 1882. – Т. 36, № 12. – С. 535–584.

11. Карцов, П. П. Граф Федор Федорович Берг, наместник в Царстве Польском. Очерк из воспоминаний / П. П. Карцов // Рус. старина. – 1883. – Т. 37, № 2. – С. 305–321.

12. [Мосолов, А. Н.] Виленские очерки 1863–1865 гг. (из воспоминаний очевидца) / [А. Н. Мосолов] // Рус. старина. – Год 14. – 1883. – Т. 40. – С. 181–200, 391–406, 573–628 ; Год 15. – 1884. – Т. 41. – С. 15–60.

13. Мосолов, А. Н. Виленские очерки 1863–1865 гг. (Муравьевское время) / А. Н. Мосолов. – СПб. : А. С. Суворин, 1898. – VII+253 с.

14. Муравьев, А. Н. Примечание к запискам графа М. Н. Муравьева / А. Н. Муравьев // Рус. архив. – Год 23. – 1885. – Т. 2. – С. 200–201.

15. Муравьев, А. Н. Рассказ брата графа М. Н. Муравьева / А. Н. Муравьев // Рус. старина. – Год 13. – 1882. – Т. 36, № 12. – С. 644–646.

16. [Муравьев, М. Н.] «Готов собою жертвовать…» : записки графа Михаила Николаевича Муравьева об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нем мятежа. 1863–1866 гг. / [М. Н. Муравьев] ; Рос. гос. б-ка. – М. : Пашков дом, 2008. – 415 с.

17. Муравьев, М. Н. Записки об управлении Северо-Западным краем и об усмирении в нем мятежа, 1863–1866 гг. / М. Н. Муравьев // Рус. старина. – Т. 36. – 1882. – № 11. – С. 387–432 ; № 12. – С. 623–646 ; Т. 37. – 1883. – № 1. – С. 131–166 ; № 2. – С. 291–304 ; № 3. – С. 615–630 ; Т. 38. – № 4. – С. 193–230 ; Т. 42. – 1884. – № 6. – С. 572–584.

18. Мураўёў, М. М. Нататкі пра кіраванне Паўночна-Заходнім краем і пра падаўленне ў ім бунту / М. М. Мураўёў. – Мінск : Лімарыус, 2016. – 221 с. – (Беларуская мемуарная бібліятэка).

19. Николаев, Г. И. По поводу «Записок» графа М. Н. Муравьева (Письмо в редакцию) / Г. И. Николаев // Истор. вестн. – Год 4. – 1883. – Т. 11. – № 3. – С. 724–726.

20. Павлов, А. С. Владимир Иванович Назимов. Очерк из новейшей летописи Северо-Западной России / А. С. Павлов // Рус. старина. – 1885. – Т. 45. – № 2. – С. 385–410 ; № 3. – С. 555–580 ; Т. 46. – № 5. – С. 323–338.

21. Павлов, А. С. Владимир Иванович Назимов, генерал-губернатор Северо-Западного края, генерал-адъютант : Очерк из новейшей летописи Северо-Зап. России / А. С. Павлов. – СПб. : Тип. В. С. Балашева, 1885. – 67 с.

22. Тимощук, В. В. Михаил Иванович Семевский, основатель исторического журнала «Русская старина». Его жизнь и деятельность, 1837–1892 : с прил. двух портретов М. И. Семевского и факсимиле его письма: биогр. очерк ; с предисл. и под ред. Н. К. Шильдера / В. В. Тимощук. – СПб. : Изд. Е. М. Семевской, 1895. – 340 с.

23. [Южаков, С. Н.] Крестьянское дело в Северо-Западном крае при генерале Муравьеве (письмо в редакцию) / [С. Н. Южаков] // Вестн. Европы. – 1883. – № 9. – С. 375–379.

24. Przyborowski, W. Pamiętnik Murawiewa «Wieszatiela» przez autora «Historii dwóch lat» / W. Przyborowski // Kwartalnik Historyczny. – 1906. – T. 20. – S. 520–528.

## References

1. [Aksakov I.] Moscow, November 13 [Concerning the Notes of M. N. Muravyov on the Insurgency in the North-West Territory in 1863–1864]. Rus' [*Rus*], 1882, November 13, no. 46, pp. 1–5 (in Russian).

2. Berg N. V. Count F. F. Berg and M. N. Muravyov. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1883, no. 4, pp. 214–216 (in Russian).

3. Berg N. V. Count Mikhail Nikolayevich Muravyov: To his "Notes", published in the "Russian Antiquity" ed. 1882–1883 years. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1883, no. 4, pp. 216–229 (in Russian).

4. Valuev P. A. Notes on "Notes" of Count M. N. Muravyov. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1890, vol. 65, no. 12, pp. 857–863 (in Russian).

5. Vladimirov A. P. On the introduction of the Russian language into the worship of the Catholic and Protestant churches in the North-West Territory. *Vestnik Evropy* [Europe Bulletin], 1881, no. 2, pp. 366–375 (in Russian).

6. E. L. Investigation and trial of Polish rebels in the North-West Territory in 1863–1864 (According to official documents). *Viestnik Evropy* [Europe Bulletin], 1883, no. 1, pp. 388–399 (in Russian).

7. Egorov A. E. [Memoirs]. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1883, vol. 38, no. 4, pp. 210–214 (in Russian).

8. Karnovich E. P. Thoughts on the "Notes" of M. N. Muravyov. *Nablyudatel'* [Observer], 1883, no. 11, pp. 153–178; no. 12, pp. 21–39 (in Russian).

9. Karnovich E. P. *Thoughts on "Notes" of M. N. Muravyov*. [S. l., s. n., 1883], pp. 153–178, 21–39 (in Russian).

10. Kartsov P. P. Warsaw in 1860–1861. From the memoirs of Lieutenant-General. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1882, vol. 36, no. 12, pp. 535–584 (in Russian).

11. Kartsov P. P. Count Fiodor Fiodorovich Berg, deputy in the Kingdom of Poland. Essay from the memoirs. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1883, vol. 37, no. 2, pp. 305–321 (in Russian).

12. [Mosolov A. N.] Vilna essays of 1863–1865. (From the memories of an eyewitness). *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1883, vol. 40, pp. 181–200, 391–406, 573–628; 1884, vol. 41, pp. 15–60 (in Russian).

13. Mosolov A. N. *Vilna essays of 1863–1865. (Time of Muravyov).* St. Petersburg, A. S. Suvorin Publ., 1898. VII+253 p. (in Russian).

14. Murav'ev A. N. Remark to the notes of Count M. N. Muravyov. *Russkii Arkhiv* [Russian Archive], 1885, vol. 2, pp. 200–201 (in Russian).

15. Murav'ev A. N. The story of the brother of Count M. N. Muraviev. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1882, vol. 36, no. 12, pp. 644–646 (in Russian).

16. [Murav'ev M. N.] *"Ready to sacrifice myself...": notes of Count Mikhail Muravyov on the governance of the North-West Territory and on the suppression of the Insurgency in it. 1863–1866*. Moscow, Pashkov Dom Publ., 2008. 415 p. (in Russian).

17. Murav'ev M. N. Notes on the governance of the North-West Territory and on the suppression of the Insurgency in it, 1863–1866. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1882, vol. 36, no. 11, pp. 387–432; no. 12, pp. 623–646; 1883, vol. 37, no. 1, pp. 131–166; no. 2, pp. 291–304; no. 3, pp. 615–630; vol. 38, no. 4, pp. 193–230; 1884, vol. 42, no. 6, pp. 572–584 (in Russian).

18. Muraŭjeŭ M. M. *Notes on the governance of the North-West Territory and on the suppression of the Insurgency in it*. Minsk, Limaryus Publ., 2016. 221 p. (in Belarusian).

19. Nikolaev G. I. Concerning the Notes of M. N. Muravyov (Letter to the editorial office). *Istoricheskii Vestnik* [Historical Bulletin], 1883, vol. 11, no. 3, pp. 724–726 (in Russian).

20. Pavlov A. S. Vladimir Ivanovich Nazimov. An outline from the newest chronicle of northwestern Russia. *Russkaya Starina* [Russian Antiquity], 1885, vol. 45, no. 2, pp. 385–410; no 3, pp. 555–580; vol. 46, no. 5, pp. 323–338 (in Russian).

21. Pavlov A. S. *Vladimir Ivanovich Nazimov, Governor-General of the North-Western Territory, Adjutant-General: A sketch from the latest chronicle of the North-west. Russia*. St. Petersburg, Typography of V. S. Balashov Publ., 1885. 67 p. (in Russian).

22. Timoshchuk V. V. *Mikhail Ivanovich Semevsky, the founder of the historical journal "Russian Antiquity". His life and work, 1837–1892*. St. Petersburg, E. M. Semevskaya Publ., 1895. 340 p. (in Russian).

23. [Yuzhakov S. N.] Peasant business in the North-West Territory under General Muravyov (letter to the editorial office). *Viestnik Evropy* [Europe Bulletin], 1883, no. 9, pp. 375–379 (in Russian).

24. Przyborowski W. Memories of Muravyov the "Hangman", prepared by the author of "History of two years". *Kwartalnik Historyczny* [Quarterly Historical Magazine], 1906, vol. 20, pp. 520–528 (in Polish).

## Информация об авторе

**Матвейчик Дмитрий Чеславович** – кандидат исторических наук, заведующий отделом публикации документов. Национальный исторический архив Беларуси (ул. Кропоткина, 55, 220002, Минск, Республика Беларусь). E-mail: macviej@mail.ru

## Information about the author

**Dzmitry Ch. Matveichyk** – Ph. D. (Hist.), Head of the Department of Document Publication. National Historical Archives of Belarus (55 Kropotkin Str., Minsk 220002, Belarus). E-mail: macviej@mail.ru